# Тав. ПАНАМАРЭНКА П. К.—кандыдат у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР

БАРАНАВІЧЫ, 15 лютага. (БЕЛТА). Працяглыя гудкі абвясцілі аб абедзенным перапынку ў Баранавіцкім чыгуначным дэпо. У механічны цэх на прадвыбарчы сход, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, прышлі машыністы, капельшчыкі, токары, слесары. Многія з 500 прыйшоўшых на сход зусім нядаўна атрымалі работу.

Першым у наступіўшай цішыні ўзяў слова начальнік Палітаддзела Брэст-Літоўскай чыгункі А. Н. Жыжын:

— Сёння рабочыя дэпо разам з інжынерна-тэхнічнымі работнікамі і служачымі сабраліся сюды, каб вылучыць лепшага з лепшых прадстаўнікоў з'еднанага беларускага народа кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР. Сход павінен астанавіць свой выбар на чалавеку, які да канца аддадзены совецкаму народу і дастоен гэтага вялікага давер'я.

Слова атрымлівае пажылы кадравы машыніст—інструктар Д. В. Філімонаў:

— Дваццаць доўгіх пакутлівых год лепшыя сыны беларускага народа гнілі, хто ў турме, а хто пад ярмом памешчыка, ці капіталіста. Доблесная Чырвоная Армія прагнала польскіх паноў з нашай роднай зямлі і ім не вярнуцца ніколі. Наш працоўны народ у час выбараў у Народнае Сабранне і правядзення Народнага Сабрання Заходняй Беларусі выказаў сваю волю—далучыцца да Совецкага Саюза, уліцца ў адзіную сям'ю народаў вялікай краіны соцыялізма.

— Сёння,—прадаўжае тав. Філімонаў,—мы павінны вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР чалавека, які змог-бы кіраваць вялікай гарачай работай па ператварэнню заходніх абласцей у квітнеючыя абласці орданоснай Беларускай ССР. Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР па 606 выбарчай акрузе тав. Панамарэнка Панцелеймона Кандрацьевіча. Тав. Панамарэнка нарадзіўся ў 1902 годзе, член Комуністычнай партыі з 1925 года, сакратар ЦК КП(б) Беларусі, член Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў), член Ваеннага Совета Беларускай Асобай Ваеннай Акругі. За заслугі перад радзімай краіна ўзнагародзіла тав. Панамарэнка ордэнам Леніна.

Мы ўсе добра ведаем тав. Панамарэнка, як вернага большэвіка ленінска-сталінскага тыпа. Я вылучаю яго з поўнай упэўненасцю, што народ падтрымае маю прапанову, а тав. Панамарэнка поўнасцю апраўдае наша давер'е.

На трыбуне 25-гадовы слесар Аляксандр Міхайлавіч Піткевіч.

— Гістарычны дзень—17 верасня,—гаворыць ён,—зрабіў нас шчаслівымі на ўсё жыццё. Права выбіраць і быць выбраным у Вярхоўныя органы ўлады дала нам Сталінская Канстытуцыя, вялікі правадыр народаў таварыш Сталін. Вось чаму, калі я зараз выступаю, перад маімі вачыма стаіць вобраз найвялікшага генія чалавецтва таварыша Сталіна, які прынёс нам свабоду, радасць і лікаванне. Кожны з нас гатоў аддаць сваё жыццё за тую шчаслівую будучыню, да якой вядзе нас вялікі Сталін. Я поўнасцю ад душы падтрымліваю прапанову тав. Філімонава. Упэўнен, што тав. Панамарэнка будзе нашым дастойным дэпутатам.

Гарачай авацыяй было сустрэта выступленне рабочага-капельшчыка С. А. Шашковіча.

— Вякамі нас,—гаворыць ён,—заядала нястача. Солі не было, і мы бульбу па тры разы варылі ў адной і той-жа вадзе. Хлеба не было і мы мякіну елі, прымешваючы крапіву і другія травы. Хадзілі мы ў брудных лахманах.

Мы ведалі, што недалёка, усяго толькі за 150 кілометраў ад нас, жывуць іначай, заможна і культурна. Дзень 17 верасня прынёс нам шчасце і радасць вызвалення.

І зараз я, стары рабочы, які прапрацаваў дзесяткі год на капіталістаў, як адзін з гаспадароў нашай краіны, цалкам падтрымліваю прапанову таварышоў і прапаную паслаць у Вярхоўны Совет СССР лепшага большэвіка тав. Панамарэнка.

Услед за старым рабочым выступае маладая работніца канторы Вера Скроб:

— Я поўнасцю падтрымліваю выступаўшых таварышоў і прапаную вылучыць кандыдатуру таварыша Панамарэнка ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР. Мне дваццаць год. Я буду галасаваць упершыню, упершыню будуць галасаваць і тыя, якім больш 60 год, бо ў панскай Польшчы яны або наогул не трымалі ўдзелу ў галасаванні за так званых панскіх паслоў, або галасавалі з-пад плёткі. Цяпер-жа мы ўсе будзем галасаваць за нашу радасць, за шчасце, за вялікага Сталіна.